ТОП-10 каталіцкіх жамчужын Гродзеншчыны

Аўтар: Кінга Красіцкая
30.06.2019 00:00



Лета – спрыяльны час для адпачынку. Для адных ён асацыіруецца ў першую чаргу з паездкай на мора, для другіх – з падарожжамі па гарадах і мястэчках. Многія нашы суайчыннікі ўжо даўно выбіраюць родную старонку ў якасці альтэрнатывы замежным курортам. І ў гэтым няма нічога дзіўнага: маем прыгожыя краявіды, багатую гісторыю. Наведваючы каталіцкія святыні, можам узбагаціць сваё бачанне адносна нашай самабытнай архітэктуры. Прапануем гід па месцах, якія сапраўды варта наведаць. Летні час з'яўляецца для гэтага добрай нагодай. †

Касцёл св. Уладзіслава ў Суботніках



Святыня ў неагатычным стылі пабудавана ў 1904–1907 гадах на сродкі графа Уладзіслава Умястоўскага і яго жонкі Яніны. У сужэнстве не было дзяцей, і граф вырашыў, што гэта праклён роду, таму задумаў будаўніцтва касцёла. Для фундатара было важна, каб святыня насіла імя якоганебудзь святога, у выніку спыніўся на Уладзіславе Венгерскім, які прынёс хрысціянства ў Венгрыю. Дарэчы, касцёл у Суботніках з'яўляецца адзіным у Беларусі, які носіць імя гэтага святога.

У святыні знаходзіцца крыпта з родавай пахавальняй Умястоўскіх і Дунін-Раецкіх, размешчаная пад асноўным алтаром касцёла. Першым у ёй пахавалі заснавальніка – Уладзіслава, а затым туды былі ўнесены парэшткі яго сваякоў. Пра гэта падрабязна паведамляе мемарыяльная дошка, устаноўленая ў 1931 годзе. Толькі на надмагіллі, прызначаным для Яніны (яна прадбачліва паклапацілася пра яго сама), няма ні імя, ні дат: графіня памерла ўдалечыні ад родавага гнязда – у Рыме (Італія). Стваральнікамі некропаля былі майстры са Швецыі.

Суботніцкі касцёл – сапраўдны музей, экспанаты якога па вартасці ацанілі б многія мастацтвазнаўцы. Тут ёсць арган, які старэйшы за сам будынак – гэта спадчына ад старажытнага, яшчэ драўлянага касцёла. Таксама не могуць не ўразіць старыя касцёльныя лаўкі, створаныя ў 1884 годзе – на іх сядзелі самі Умястоўскія. Сярод іншых старадаўніх прадметаў – мармуровая купель для хрышчэння немаўлят, скульптуры.

Касцёл ужо здалёк зачароўвае прыгожай сілуэтнай графікай: высокая трох'ярусная званіца вылучаецца на фоне неба высокім шпілем. Такой жа "калючай" выглядае цэнтральная брама, убудаваная ў агароджу. Знутры святыню ўпрыгожваюць 3 алтары: галоўны – св. Уладзіслава (калісьці было 54 воты), левы бакавы – Маці Божай Ружанцовай з цудадзейным абразом, правы – св. Юрыя.

Касцёл Найсвяцейшай Тройцы ў Гервятах



Цудоўная святыня ў неагатычным стылі, якая магла б упрыгожыць любую еўрапейскую сталіцу, пабудавана ў 1899–1903 гадах на сродкі князя Альшэўскага. Як аказалася, месца для яе было абрана не самае ўдалае: грунтавыя воды пастаянна размывалі падмурак касцёла. Каб выправіць сітуацыю, будаўнікам давялося павярнуць рэчышча мясцовай ракі Лошы. А на яе беразе была спецыяльна ўзведзена цагельня, дзе выраблялі будматэрыял высокай якасці (кажуць, у кожную цагліну для моцы дадавалі па курыным яйку). У выніку на самым высокім месцы Гервятаў вырас адзін з найвышэйшых храмаў Беларусі: вышыня званіцы складае 61 метр. Шпіль вянчае крыж, які знізу здаецца зусім невялікім, але на самой справе ён 6-метровы. Касцёл дзівіць багаццем гатычных элементаў, за што яго часта параўноўваюць з саборам Парыжскай Божай Маці і Кёльнскім саборам.

Унутранае ўбранне святыні з'яўляецца выдатным працягам яе знешняга аблічча: выглядае строга і светла. Тым не менш, у аздабленні інтэр'ера маюцца ўнікальныя і складаныя элементы. Напрыклад, на высокім майстэрскім узроўні выкананы металічныя

каваныя дэталі, вітражы з каляровага шкла, драўляныя статуі, крыжы. А цэнтральныя ўваходныя металічныя вароты – гэта сапраўдны твор мастацтва.

Колькі ж часу адвесці на наведванне гэтага касцёла? 10-15 хвілін хопіць, каб хутка прабегчыся вакол і зрабіць некалькі фотаздымкаў святыні і скульптур 12-ці апосталаў, гадзіну – каб пабываць на службе і паслухаць гукі аргана. І больш за палову дня можа спатрэбіцца, каб палюбавацца зелянінай у дэндрарыі (тут больш за 2 тысячы відаў раслін).

Касцёл свсв. апосталаў Пятра і Паўла ў Старых Васілішках



Узведзены ў 1897–1903 гадах па праекце польскага архітэктара Канстанціна Вайцяхоўскага. Фундавала будову святыні шмат людзей, у тым ліку яўрэйскага паходжання. Аб гэтым сведчаць выявы шасціканечнай зоркі на кожнай з грані вежаў і імёны, выгравіраваныя на плітах падмурка касцёла.

Мастацкая выразнасць інтэр'ера храма дасягаецца дзякуючы выкарыстанню элементаў керамікі, чаканкі, разьбы па дрэве. Унутраная прастора раздзелена магутнымі слупамі на 3 нефы і накрыта высокімі стральчатымі скляпеннямі. На міжнефавых слупах устаноўлены скульптуры апосталаў. На бакавых барэльефных карцінах-пано паказаны Крыжовы шлях Хрыста. Сюжэты з жыцця Збаўцы, а таксама апосталаў Пятра і Паўла адлюстроўваюць вітражы, зробленыя на рэнесансны манер. Асаблівую ўвагу прыцягваюць бакавыя нішы. У іх створаны штучныя пячоры з экспазіцыяй прывітання вешчунамі нараджэння Хрыста. Такіх пячор няма больш нідзе ў Беларусі.

Апрача іншага, касцёл у Старых Васілішках вядомы тым, што ў ім спяваў у дзяцінстве сусветна вядомы музыкант Чэслаў Немэн (Выдржыцкі), а ягоны бацька іграў там на аргане. Гэты інструмент быў перанесены ў сучасны касцёл з ранейшага драўлянага. Існуе меркаванне, што яго вырабам займаліся нямецкія спецыялісты з гамбургскай

майстэрні Фрыдрыха Самуэля Янтцона.

Касцёл Найсвяцейшай Тройцы ў Ішчолне



Святыня ў стылі позняга барока пабудавана ў 1758 годзе дзякуючы намаганням гарадзенскага харужага Іосіфа Вала. Стаіць на вялікім склепе, дзе ляжаць парэшткі практычна ўсіх уладальнікаў Ішчолна з XVI стагоддзя. Прама перад уваходам у касцёл размешчаны 2 магільныя пліты. Надпісы на іх сцёртыя, таму разабраць, хто пад імі пахаваны, немагчыма. Аднак існуе мясцовае паданне, што тут некалі жыў ганарысты шляхціц, які на схіле жыцця ўсвядоміў: быў несправядлівы да людзей. І таму завяшчаў пахаваць яго перад уваходам у касцёл, каб кожны, хто будзе ісці, таптаў яго гонар. Падчас паўстання 1863 года ў касцёле служыў кс. Адам Фалькоўскі. Тут, з кафедры, ён агучыў для парафіян Маніфест народнага ўрада. Па даносе аднаго з жыхароў святар быў арыштаваны і расстраляны ў Лідзе. У знак яго адыходу ў касцёле білі ўсе 3 званы без прыпынку.

Знутры храм вылучаецца барочным алтаром, упрыгожаным ляпнінай і карынфскімі калонамі. Захаваўся тут і старадаўні арган на 9 галасоў.

Асаблівую цікавасць уяўляе сабой сонечны гадзіннік, які знаходзіцца на каменным пастаменце ў паўднёвай частцы касцёльнага двара. Ён быў зроблены ў XVIII стагоддзі віленскім майстрам Малецкім. Паказваў час вельмі дакладна дзякуючы таму, што пры стварэнні ўлічвалася шырата, на якой ён будзе выкарыстоўвацца. Гадзіннік цалкам захаваўся, за выключэннем стрэлачак на цыферблаце. Замест іх сучасны майстар паставіў драўляную дэталь, але яна паказвае час толькі прыблізна.

Касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі ў Жалудку

ТОП-10 каталіцкіх жамчужын Гродзеншчыны

Аўтар: Кінга Красіцкая
30.06.2019 00:00









ТОП-10 каталіцкіх жамчужын Гродзеншчыны

Аўтар: Кінга Красіцкая
30.06.2019 00:00



